макрообъективном, микросубъективном и микрообъективном уровнях. Социально-культурные меры профилактики должны охватывать молодежную среду в целом, уделяя особое внимание выходцам из неблагополучных семей, лицам, склонным к агрессии, носителям молодежных субкультур, участникам неформальных объединений и склонным к девиациям уличным компаниям, и осуществляться в условиях конструктивного взаимодействия учреждений образования, родительской общественности и учащихся с комиссией и инспекцией по делам несовершеннолетних, судом, прокуратурой в проведении родительских собраний, педагогических советов, классных часов, элективных курсов по вопросам правового воспитания учащихся.

В последние годы глобальной проблемой является использование киберпространства в целях популяризации экстремистских идей в социальных сетях, форумах и мессенджерах. Данный феномен получил название информационный экстремизм, под которым понимается деятельность, связанная с созданием, хранением и (или) распространением посредством сети Интернет информации экстремистского характера, оказывающей деструктивное воздействие на психику людей. В связи с этим возникает необходимость: разработки критериев отнесения материалов, размещенных в сети Интернет, к экстремистским; установления распространяющих их лиц; профилактического воздействия на владельцев веб-ресурсов и улучшения материально-технической базы и квалификации сотрудников правоохранительных органов.

***Калавур А. А.***

## ПАРТЫСІПАТОРНЫЯ ПРАКТЫКІ Ў РУМЫНІІ: КЕЙСЫ КЛУЖ-НАПОКА І СІБІЎ

*Калавур Андрэй Аляксандравіч, аспірант Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, г. Мінск, Беларусь, kallaur.andrej@gmail.com*
*Навуковы кіраўнік: канд. гіст. навук, дацэнт Слуцкая Л. У.*

Сучасная сістэма мясцовага кіравання і самакіравання Румыніі сфармавалася пад уплывам двух фактараў: дэмакратызацыі палітычнага жыцця пасля рэвалюцыі 1989 г. і інтэграцыі з Еўрапейскім звязам (ЕЗ). Менавіта ратыфікацыя Еўрапейскай хартыі мясцовага самакіравання і ажыццяўленне рэформаў у сферы дэцэнтралізацыі і дэканцэнтрацыі, згодна з Хельсінскім рашэннем аб працэсе еўраінтеграцыі ў 1999 г., адлюстроўвалі прагу румынаў да дэмакратызацыі і інтэграцыі з ЕЗ. Прававая і інстытуцыянальная аснова мясцовай сістэмы была закладзена ў Канстытуцыі і законах “Аб мясцовым грамадскім кіраванні” і “Аб дэцэнтралізацыі”. Згодна з прававой базай, мясцовае кіраванне абапіраецца на прынцыпы дэцэнтралізацыі, самакіравання, дэканцэнтрацыі. Юрыдычна замацаваны дзеянні па судоваму перагляду рашэнняў мясцовай улады, якія могуць быць ініцыяваны грамадзянамі.

Прававая база дазваляе ажыццяўляць партысіпаторныя практыкі: напрыклад, грамадская ініцыятыва можа быць сфармулявана ў якасці праекта, які разглядаецца мясцовым саветам пры ўмове, што ініцыятыву падтрымала не менш, чым 5 % выбаршчыкаў у пэўнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінцы.

Гарады Клуж-Напока і Сібіў з'яўляюцца прыкладамі таго, як партысіпаторныя практыкі паспяхова ажыццяўляюцца. На заканадаўчым узроўні не існуе пэўных формаў або механізмаў ужытку такіх практык, таму кожны горад эксперыментуе па-свойму. Сярод партысіпаторных практык Клуж-Напока можна вылучыць наступныя: партысіпаторнае бюджэтаванне (ПБ) у рэжыме анлайн, а таксама калегіяльная распрацоўка гарадской стратэгіі развіцця. ПБ у рэжыме анлайн паступова рэалізуецца ў Клужы з 2013 г. пры падтрымцы мэрыі. На сённяшні дзень ПБ мае анлайн платформу, на якой мясцовыя жыхары могуць апублікаваць свой праект. Тэхнічная камісія выбірае самыя мэтазгодныя і дапускае іх да галасавання, больш папулярныя праекты атрымліваюць фінансаванне з мясцовага бюджэту. У распрацоўку стратэгіі развіцця ўцягнута мясцовая акадэмічная супольнасць, дзеячы культуры, актывісты – усяго 24 калектывы, падзеленых па розных тэматыках (з большага там працуюць спецыялісты ў сваіх галінах): ад сінематографа да IT-сферы. Кожны калектыў мае каардынатара, метадалогію, аўтаномнасць і на выхадзе прапаноўвае план развіцця з пэўнымі крокамі дзеяння. У сваю чаргу, аперацыйныя групы – прадстаўнікі мясцовай супольнасці і адміністрацыі – рэалізуюць агульную стратэгію, ажыццяўляюць маніторынг і ацэньванне выканання плана. Улады горада Сібіў уцягваюць у распрацоўку стратэгіі развіцця шырокія колы грамадства. Менавіта тут рэалізуюцца формы грамадскіх кансультацый (дыскусій), дэбатаў (падчас гарадскіх сходаў), анкетавання. Мэрыя звяртаецца да НДА, каб яны разам распрацавалі стратэгію развіцця: правялі даследаванні горада, кансультацыі з грамадскай супольнасцю па 4 накірунках у рэжыме афлайн і сустрэчы з жыхарамі раёнаў горада, падчас якіх вылучаюцца неабходныя праекты. Напрыканцы стратэгія праходзіць зацвярджэнне ў мясцовым савеце.

Увогуле, 59 % мясцовых адзінак Румыніі робяць як мінімум адно апытанне жыхароў, 63 % адзінак – праводзяць як мінімум адну публічную дыскусію, 88 % мясцовых органаў уцягваюць у распрацоўку плана развіцця (на этапе вылучэння ініцыятыў) грамадскіх прадстаўнікой і сацыяльныя групы, але толькі 56 % дазваляюць ім удзельнічаць на этапе рэалізацыі і маніторынга.

Адна з галоўных прычын замацавання партысіпаторных практык і стратэгічнага планавання ўвогуле – гэта выкананне неабходных умоў для доступу да еўрапейскіх фондаў. З другога боку, такія практыкі наладжваюць камунікацыю паміж органамі ўлады і грамадскасцю, дазваляюць праводзіць палітыку больш набліжаную да патрэб людзей, таму могуць папярэдзіць гарадскія канфлікты або зусім іх дэвальвіраваць.